ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ЮБІЛЕЙНЫ

Добры дзень, юбілейны! Ужо шосты дзень адлічвае свой час 67-ы. У юбілейным годзе перад калектывам нашага універсітэта стаяць шматлікія і складаныя задачы. Адной з іх з'яўляецца бягучая сесія. Правесці яе арганізавана, на высокім узроўні — да гэтага імкнуцца выкладчыкі і студэнты. Пакуль што факты гавораць аб тым, што вынікі прайшоўшых экзаменаў лепшыя, чым ў мінулую зімовую сесію. І гэта знамянальна. Юбілей патрабуе ад кожнага самаадданай працы, больш старанных адносін да сваіх грамадскіх абавязкаў.

Мы заклікаем усіх студэнтаў парадаваць краіну трывалымі і глыбокімі ведамі, адзначыць пачатак года новымі поспехамі ў вучобе.



Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 1 (652) Пятніца, 6 студзеня 1967 года. Год выдання XX. Цана 2 кап.

Нядаўна ва ўрачыстых абставінах групе в'етнамскіх студэнтаў былі ўручаны дыпломы і значкі з выпадку заканчэння імі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна. Радасна на душы ў в'етнамскіх юнакоў. Вучоба паспяхова закончана і неўзабаве высокакваліфікаванымі спецыялістамі яны вернуцца на Радзіму і ўзначаляць мужных і працалюбівых рабочых ДРВ. Шчаслівай дарогі вам, таварышы! Плённай працы на карысць народа!

На здымку: (злева направа) Нгуен Тхе Хіен, Бак Хынг Ханг, якім прарэктар Л. В. Валадзько ўручае значкі БДУ імя Ул. І. Леніна.

СТАРТ УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСА

Наша газета паведамляла, што ва універсітэце разгарнулася падрыхтоўка да Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі УЛКСМ і міжнароднаму маладзёжнаму руху, прысвечанаму 50-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Нядаўна рэктар А. Н. Сеўчанка выдаў загад, у якім устаноўлены тэрміны заканчэння работ ва універсітэце і зацверджана конкурсная камісія. Старшыня яе — загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі прафесар І. М. Лушчыцкі, намеснік — прафесар М. Е. Шкляр, члены — загадчык кафедры палітэканомі дацэнт С. Я. Янчанка, загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прафесар В. І. Сцяпанаў, загадчык кафедры навуковага камунізма дацэнт М. Г. Круцько, загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі дацэнт С. А. Умрэйка, дэканы: гістфака — П. З. Савачкін, юрфака В. А. Шкурко, загадчык НСТ універсітэта В. А. Калечыц, ад камітэта камсамола—В. А. Тхарова, ад прафкома—І. Г. Баярчук.

Тэрмін напісання работ — 10 лютага 1967 года. Студэнцкая навуковая канферэнцыя адбудзецца 22—23 сакавіка. На ёй будуць адабраны лепшыя матэрыялы на Рэспубліканскі конкурс (тэрмін прадстаўлення работ у Рэспубліканскі аргкамітэт да 10 красавіка 1967 года).

Расказваючы аб гэтым рашэнні, мы яшчэ раз звяртаемся да студэнтаў з заклікам прыняць самы актыўны ўдзел ва Усесаюзным конкурсе.

ЦІШЭЙ, ІДУЦЬ ЭКЗАМЕНЫ

ПЕРАД самым Новым годам, 31 снежня, выпускнікі гістфака здавалі свой чарговы экзамен. Трэба адзначыць, што да гэтага ім прышлося шмат рыхтавацца па асновах навуковага атэізму, навейшай гісторыі, асновах дзяржаўнага права. Прадметы самі па сабе складаныя, дый і лекцыі не ўсе яшчэ былі прачытаны. Але вынікі аказаліся добрымі. Па названых дысцыплінах атрымана трыццаць тры «выдатна», сорак чатыры «добра» і толькі пятнаццаць «здавальняюча».

І вось цяпер прадстаяла здаваць гісторыю філасофіі. Ужо першы адказ З. І. Сенько сведчыў аб тым, што студэнты не абмяжоўваліся канспектамі і падручнікамі. Добрае веданне першакрыніц паказалі М. П. Сіліч, Л. А. Цярэнцьева, В. Ф. Ладысеў, Л. К. Курчанкоў і іншыя.

Адказвае на пытанні Екацярына Канстанцінаўна Румоўская. Яна падрабязна характарызуе галоўныя этапы развіцця філасофіі марксізма, расказвае аб навукова-матэрыялістычных поглядах Галілея Галілео. Экзаменатар прафесар І. М. Лушчыцкі задаволены і ўжо проста з-за цікаўнасці задае пытанні аб іншых мысліцелях. І зноў вычарпальны адказ. Да экзаменацыйнага стала падыходзіць Іван Дзям'янавіч Стадуб. Камуніст Стадуб лічыцца адным з лепшых студэнтаў на факультэце. За гады вучобы ва універсітэце ён атрымаў толькі некалькі чацвёрак, а гэтую сесію, як і многія іншыя, здае толькі пакуль што на выдатна. Яго адказы былі глыбока абгрунтаванымі і змястоўнымі. З лагоднай усмешкай прафесар ставіць пяцёрку ў заліковую кніжку і жадае з такім жа поспехам падняцца яшчэ на дзве ступенькі. Так, выпускнікам гістфака засталося здаць яшчэ два экзамены. Сёння яны трымаюць справаздачу ведаў па навуковаму камунізму, а праз некалькі дзён — доктар гістарычных навук Лаўрэнцій Сямёнавіч Абэцэдарскі паставіць апошнія адзнакі ў залікоўках.

Прафесар Іван Мікалаевіч Лушчыцкі адзначыў пасля экзамена, што наогул усе студэнты добрасумленна аднесліся да вывучэння гісторыі філасофіі. Аб гэтым сведчаць вынікі — з дваццаці дзевяці чалавек 12 атрымалі пяцёркі і 17 чацвёркі. У мінулы год папяраднікі гэтага курса таксама не мелі пасрэдных адзнак, але пяцёрак у іх было менш. Камуніст Іван Дзям'янавіч Стадуб і камсамольцы Марыя Уладзіміраўна Качура, Мікалай Сцяпанавіч Сташкевіч здаюць сесію толькі на выдатна. Жадаем ім на гэтым жа ўзроўні ісці і далей у жыццё.

А. НАВІЦКІ.

Цяпер, як ніколі перапоўнены чытальныя залы бібліятэк, здараецца і так, што свабодных месц не хапае. Гэта значыць, што на ўсіх факультэтах ідуць экзамены. У бібліятэках жа застаюцца тыя, хто яшчэ мае магчымасць дзень або хоць некалькі гадзін папрацаваць над кнігай, перагарнуць канспекты. Праўда, не ўсе вялі канспекты, таму некаторым прыходзіцца звяртацца за дапамогай да сяброў. Канспекты вельмі дапамагаюць у падрыхтоўцы да экзаменаў, і ў перыяд сесіі кожны дае сабе слова, што будзе старанна запісваць усе лекцыі. Але праходзіць час, цяжкасці забываюцца, забываюцца і намеры. Аднак з усіх выпрабаванняў, як даказана практыкай, заўсёды выводзіць чыталка.

Фота А. Кадзета.



НАСТУПІЛА хвалюючая пара ў жыцці студэнтаў, асабліва напружаная яна для першакурснікаў. Гаворачы аб падрыхтоўцы да экзаменаў і іх выніках, успамінаецца адна трапная прымаўка: «Што пасееш — тое і пажнеш». І гэта сапраўды так: у адных студэнтаў ніва ведаў багатая, у іншых бедная. Інакш кажучы, у некаторых першакурснікаў-журналістаў ужо выраслі «хвасты». Узнікае пытанне, чаму адны студэнты здалі ўсе залікі, а іншыя засталіся ў даўгах?

Адказ, на маю думку, тут адзін — працавітасць, стараннасць і настойлівасць у авалодванні ведамі праявілі не ўсе.

Многа добрых слоў можна сказаць пра студэнта нашага курса Васіля Гурына. З першых дзён заняткаў ва універсітэце ён узяў цвёрды кірунак на выдатную вучобу. Акуратнае наведванне лекцый, падрабязнае канспектаванне праграмнага матэрыяла, актыўнасць на практычных занятках, правільнае размеркаванне свайго вучэбнага і волькага часу — усё гэта стала для яго законам, а адсюль і вынікі. Залікі па замежнай мове, па ўводзінах у літаратуразнаўства і іншых прадметах ён здаў паспяхова. Добры старт узялі таксама і Люда Зябко, Ядвіга Халява, Віктар Рахінскі, Васіль Шырко і іншыя.

Нажаль не ўсім прынеслі радасць першыя вынікі зімовай сесіі. Выклікае трывогу становішча спраў у Яўгена Скварчэўскага і Мікалая Макарэвіча. З сямі залікових дысцыплін яны маюць па два-тры «хвасты». А наперадзе яшчэ больш адказныя экзамены па антычнай літаратуры, гісторыі КПСС і іншыя. Як ні стараюцца яны вучыць цяпер, не спяць ночы, але тое, што было упушчана на працягу сяместра — не дагоніш.

Знайшліся і такія студэнты, якія лёгкадумна аднесліся да вывучэння гісторыі БССР. Маўляў, мы яе і так добра ведаем. Але на справе аказалася зусім інакш. Больш дзесяці чалавек не здалі заліка па гэтаму прадмету. Сярод іх А. Красінская, В. Новікава і іншыя.

На маю думку, нічога нечаканага на курсе не здарылася, проста хто старанна вучыўся, таму і спадарожнічае поспех. Вось і атрымліваецца, як у той прымаўцы: «Што пасееш — тое і пажнеш».

В. МАЛЯЎСКІ, студкор.

НА ПРАСТОР, НА ШЫРОКІ ПРАСТОР

І НА ГЭТЫ РАЗ была «рэформа». Менавіта з гэтага, нягледзячы на папрок аб імкненні гісторыкаў да рэформ, пачну сваё апавяданне аб практыцы студэнтаў чацвёртага курса гістфака. Гавораць, што розныя пераўтварэнні маюць свае плюсы.

Так з першага верасня мы сталі «эксперыментальнымі» студэнтамі. На нас пачалі выпрабоўваць рэформу: неўзабаве мы даведаліся, што практыка на адзін месяц скарачаецца, заняткаў па вячэрняй сістэме не будзе, уся ўвага — школе. Раней гэтага не было. Практыка дзялілася на тры этапы: пасіўную, актыўную і стажорскую.

Адна з лацінскіх прымавак гаворыць: «Гісторыя — настаўніца жыцця». Але большасць студэнтаў гістарычнага факультэта, як правіла, вучыла само жыццё — працавалі на вытворчасці, служылі ў Савецкай Арміі, таму ўжо ў сярэдзіне верасня (перыяд пасіўнай практыкі) у некаторых студэнтаў (Алега Шарынава, Анатоля Пугачоўскі) пробныя ўрокі сталі заліковымі. Заліковымі таму, што яны даваліся на высокім педагагічным і навуковым узроўні. Неўзабаве практыканты сталі класнымі кіраўнікамі.

Выдатныя веды, атрыманыя ста-раннай вучобай у аўдыторыях і бібліятэках, старанная падрыхтоўка да урокаў далі станоўчыя вынікі. Па заліковых уроках амаль няма троек. Іван Аўчарэнка, Яўген Мохніс, Феня Маслякова і іншыя атрымалі толькі «выдатна».

У перыяд стажыроўкі мы стараліся не толькі не дапусціць ранейшых недахопаў, але і прымяняць больш новыя формы выкладання. Так, практыканты-гісторыкі ў школе № 17 праводзілі кіна-ўрокі, урокі-лекцыі. Добрыя водгукі у метадыста 27-й школы Р. І. Хамчонак аб практыцы Леаніда Счыслёнка, Барыса Шабановіча і Тані Сімановіч.

Але ўрокі ў школе — гэта толькі частка тых ведаў, працы, старання, якія ўкладвалі гісторыкі ў час практыкі. Многа сіл яны аддавалі і выхаваўчай рабоце сярод школьнікаў. У 17-й школе студэнты дапамагалі навучэнцам падрыхтаваць даклады, стэнды, выпусцілі святочную насценную газету. Наташа Ясевіч правяла гутарку «Кастрычнік ў Мінску». Была арганізавана сустрэча з в'етнамскімі студэнтамі, якія расказалі аб мужнай барацьбе свайго народа супраць амерыканскіх агрэсараў. Анатоль Пугаўка дапамог вучням школы № 4 адшукаць патрэбныя матэрыялы аб жыцці Гай Дзмітрыевіча Гая. Яўген Мохніс сумесна з навучэнцамі 60-й школы арганізаваў пошукі дакументаў аб гераічнай барацьбе камсамольцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны ў падполлі. Соф'я Баско арганізавала экскурсію ў музей Я. Купалы. Тоня Пугач — у гістарычны музей універсітэта. Барыс Трыбулёў правёў гутарку аб «культурнай рэвалюцыі» у Кітаі.

Важна адзначыць, што ўсе гэтыя мерапрыемствы былі цікава арганізаваны, студэнты правялі іх з веданнем справы.

— Прыходзьце да нас яшчэ, — гаварылі вучні на развітанне...

Выдатна праведзеная практыка студэнтамі-гісторыкамі ў школах гаворыць аб тым, што скарачэнне практыкі на месяц з адначасовым вызваленнем ад заняткаў па вячэрняй сістэме — станоўчая мера, якая поўнасцю апраўдала сябе. Студэнты, як кажуць, адчулі дыханне школы, яе запатрабаванні, клопаты. Аб гэтым сведчаць і выступленні практыкантаў на камсамольскім сходзе, які нядаўна адбыўся на факультэце. Хутка мы пакінем сцены БДУ імя Ул. І. Леніна, але без страху: зброя ёсць, прычым, выдатная.

І. ДАРАШЭВІЧ,
студэнт чацвёртага курса гістфака.



ЦЯЖКАЯ ЗАДАЧА. Фотаэцюд А. КАДЗЕТА.

БУДНІ ПАРТЫЙНАЙ ГРУПЫ

У партгрупе другога курса юрыдычнага факультэта 43 камуністы. Гэта нямала, калі параўнаць яе з іншымі, дзе налічваецца па пяцьдзесяць камуністаў. Характэрна, што група з кожным днём папаўняецца камуністамі. Нядаўна Вечаславу Разумнаву, Валянціна Паленая, Аляксей Ярмоленка, Вечаславу Грэчка былі прыняты у члены КПСС.

Шмат ўвагі ўдзяляюць камуністы рабоце з камсамольцамі: дастойных рыхтуюць у рады партыі, дапамагаюць арганізоўваць камсамольскія сходы, цікавыя сустрэчы, вечары адпачынку.

Пра свае справы хлопцы расказваюць з захапленнем. Слухаеш і зайздросціш іх поспехам, іх жыццю і імкненню. Чаго толькі не пачуеш. Гэта і хваляванні перад экзаменамі, і трэці працоўны семестр, расказваючы пра які, яны не забываюць успомніць Вечаслава Разумава, які за выдатную працу на ніве ўзнагароджан Граматай ЦК УЛКСМ. Ганарацца яны і дамамі, якія былі пабудаваны іх рукамі, і працай у саўгасе на ўборцы бульбы восенню мінулага года, за што многія камуністы таксама былі ўзнагароджаны ганаровымі граматамі.

Паўстае пытанне, чаму так цікава жыве курс, адкуль ён бярэ столькі энергіі і сілы для ўсіх карысных грамадскіх спраў? Адказ тут, бадай, адзіны — пачуццё калектывізма, узаемадапамогі што-хвілінная адчуванне таго, што ты з'яўляешся членам КПСС. Усе камуністы стараюцца быць у авангардзе добрых спраў групы. Так, аператыўны атрад узначальвае камуніст Аляксей Бажкоў. Часта можна бачыць хлопцаў з яго атрада з чырвонымі павязкамі ў родным горадзе, дзе яны аберагаюць спакой і цішыню.

У многім работа групы залежыць ад яе кіраўніка, ад клопатаў аб ёй партыйнай арганізацыі факультэта. Любяць Генадзя Вярцінскага камуністы і камсамольцы свайго кіраўніка, як чулага і добрага таварыша.

— Іншы раз мне здаецца, што не ўсё ідзе у групе добра, — гаворыць ён, — што ты не дапрацаваў нечага, не дагледзеў.

Такія сумненні маюць пад сабой некаторую аснову. Дзем'яновіча прышлося выключыць з радоў КПСС...

На апошнім нашым групавым сходзе мы горача абмяркоўвалі пытанне аб сесіі, задачах кожнага камуніста. У прамовах выступаючых адчувалася, што група старанна падрыхтавалася да гэтага адказнага перыяду ў студэнцкім жыцці, што усе камуністы глыбока авалодваюць ведамі...

Паспяхова здаць сесію — такую задачу паставілі перад сабой камуністы групы. І мне здаецца, што поспехі ў іх будуць добрыя, бо куды ні заглянеш, у аўдыторыю ці бібліятэку — бачыш схіліўшыхся над кніжкамі юнакоў і дзяўчат з другога юрыдычнага.

Трывалых ведаў вам, таварышы, выдатных і добрых адзнак у залікоўках.

В. РЫДКІЙ.
студкор.

ВЫДАТНЫ ДЭБЮТ

ПЯЦЁРАК І ЧАЦВЁРАК

Ціха і ў той жа час напружана ля аўдыторыі нумар 47. Шостая — сёмая група III курса хімфака здае экзамен. Ужо так павялося тут, што на дзвярах вывешваецца графік выніка экзаменаў. Прабягаю вачыма прозвішчы. Іх многа. Экзамен падыходзіць ужо да канца, але ў гэтым доўгім спісу мне не ўдалося адшукаць ніводнай тройкі, куды ні глянь—усюды пяцёркі і чацвёркі...

— Па педагогіцы сорам атрымаць тройку, — гавораць студэнты.

І гэта сапраўды так. Неўзабаве ўсім ім прыдзецца працаваць на вытворчасці, дзе праца будзе патрабаваць ад іх высокіх ведаў, а калектыў — выдатных педагагічных навыкаў.

Дарэчы, у хімікаў групы ў гэтым семестры не першы ўжо экзамен. Нядаўна яны выдатна здалі гістарычны матэрыялізм. Пасля двух удалых тураў вызначыліся лідэры, тыя, хто атрымлівае толькі пяцёркі. Гэта Тамара Самасейка, Віця Цітоў, Іра Дрозд, Толя Ката-Ладуцька.

Б. РОШЧЫН.

Чытач, паглядзі на гэтыя здымкі. На правым — задумёная Рэма Ефіменка. Яна выпускніца філалагічнага факультэта. У юбілейным годзе атрымае дыплом аб заканчэнні вышэйшай адукацыі. А побач — першакурсніца з фізфака Іна Якавенка. Яна здае першую сесію ў жыцці...

Справы кафедральныя

СУВЯЗЬ З ПРАКТЫКАЙ—

ЦЯЖКА ўявіць сабе магчымасць выканання ускладзеных на юрыдычны факультэт адказных задач па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў і правядзення творчай даследчай работы без падтрымання пастаяннай, цеснай і ўсебаковай сувязі з практыкай судзебна-пракурорскіх органаў. Неабходнасць далейшага ўзмацнення гэтай сувязі неаднаразова падкрэслівалася ў пастановах ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР па пытаннях далейшага развіцця юрыдычнай навукі і паляпшэння юрыдычнай асветы ў краіне, павышэння барацьбы са злачынствамі і паляпшэння работы органаў суда, пракуратуры, абароны грамадскага парадку.

Кіруючыся гэтымі ўказаннямі, дэканат, грамадскія арганізацыі і кафедры юрыдычнага факультэта прыкметна ўзмацнілі свае сувязі з практыкай. Цеснае супрацоўніцтва прафесарска - выкладчыцкага складу з органамі суда, следчых органаў, пракурорскага нагляду, міліцыі і іншымі дзяржаўнымі органамі і грамадзянскімі арганізацыямі ўсё больш і больш становіцца неад'емнай часткай работы ўсіх кафедраў факультэта. Сёння мы раскажам аб рабоце, якая праводзіцца ў гэтым кірунку на кафедры крымінальнага права.

Некалькі год таму назад быў створаны кансультатыўны савет пры Вярхоўным судзе БССР, у які ў ліку іншых увайшлі таксама і чатыры супрацоўнікі нашай кафедры: І. І. Гарэлік, М. Н. Меркушаў, І. С. Цішкевіч, В. А. Шкурко. Яны прымаюць самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і абмеркаванні праектаў кіруючых пастаноў Пленума Вярхоўнага суда рэспублікі, у абагульненнях судовай практыкі, у падрыхтоўцы «Агляду заканадаўства і судовай практыкі БССР», якія выдаюцца навукова-кансультацыйным саветам, у абмеркаванні на пасяджэннях Пленума пратэстаў Старшыні Вярхоўнага суда і Пракурора БССР і яго намеснікаў па канкрэтных крымінальных справах.

Таварышы І. І. Гарэлік і В. А. Шкурко на працягу некалькіх гадоў прымаюць актыўны ўдзел у рабоце метадычнага савета пры Кіраўніцтве выхаваўча-працоўных устаноў Міністэрства аховы грамадскага парадку Беларускай ССР. Яны ж на грамадскіх пачатках вядуць юрыдычны куток у газеце «Працоўны шлях», якая з'яўляецца органам названага кіраўніцтва, змяшчаюць у ёй артыкулы па некаторых прававых праблемах і адказы на пытанні па савецкаму праву. Да гэтай работы І. І. Гарэлік прыцягнуў таксама членаў навуковага студэнцкага гуртка, якім ён кіруе. У газеце «Працоўны шлях» у 1966 годзе былі змешчаны артыкулы студэнтаў А. Бондаравай «Датэрміновае зняцце судзімасці», Л. Байнаровіча «Датэрміновае вызваленне ад пакарання», Ф. Гурвіч «Хуліганства — цяжкае злачынства», І. Мурашка «Адказнасць рацыдзівістаў», Н. Пеўнева «Памілаванне — акт гуманізма» і іншыя.

За шматгадовую працу па аказанню дапамогі органам аховы грамадскага парадку таварышы І. І. Гарэлік і В. А. Шкурко ўзнагароджаны граматамі Міністэрства аховы грамадскага парадку Беларускай ССР.

Супрацоўнікі кафедры рэгулярна даюць пісьмовыя і вусныя кансультацыі судова-пракурорскім работнікам рэспублікі па спрэчных пытаннях, якія ўзнікаюць пры судовым разглядзе канкрэтных крымінальных спраў ці пры ажыццяўленні пракурорскага нагляду за дакладным выкананнем спраў ці пры ажыццяўленні пракурорскага нагляду за дакладным выкананнем законаў. Выкладчыкаў часта можна бачыць у пракуратурах і судах, дзе яны па асабістай ініцыятыве ці па просьбе работнікаў гэтых дзяржаўных органаў вывучаюць канкрэтныя крымінальныя справы, знаёмяцца з праектамі інфармацыйных і метадычных пісем, пастаноў, пратэстаў і г. д., выказваюць свае думкі па пытаннях, якімі цікавяцца практычныя работнікі.

Сур'ёзную дапамогу дзяржаўным органам, якія вядуць барацьбу са злачынствам, аказвае каменціраванне дзейснага заканадаўства рэспублікі. Нядаўна вышаў з друку падрыхтаваны І. І. Гарэлікам, М. Н. Меркушавым, І. С. Цішкевічам і В. А. Шкурко Каментарый да крымінальнага кодэксу БССР (25,5 друкаваныя аркушы). Каментарый напісан на аснове вывучэння судова-пракурорскай практыкі і падрабязна абмяркоўваўся да яго выдання у Вярхоўным судзе БССР. Члены Вярхоўнага суда выказалі карысныя заўвагі, якія былі прыняты да ўвагі аўтарскім калектывам. Асабліва вялікая дапамога была аказана старшынёй Вярхоўнага суда рэспублікі С. Т. Шардыка, пад рэдакцыяй якога вышла гэтая карысная кніга.

Матэрыялы судова-пракурорскай практыкі рэспублікі шырока выкарыстоўваюцца ў манаграфіях і навуковых артыкулах членаў кафедры. На аснове гэтага ўносяцца канкрэтныя прапановы па далейшаму ўдасканаленню крымі-



ІНІЦЫЯТЫЎНЫ КУРАТАР

Толькі з гэтага навучальнага года пачаў сваю выкладчыцкую дзейнасць кандыдат гістарычных навук В. А. Баркан, але і за гэты кароткі час змог заявіць аб сабе, як аб добрым выхаванцу моладзі. З яго прыходам ў 12 групу фізічнага факультэта куратарам тут значна ажывілася выхаваўчая работа. Акрамя цікавых гутарак на самыя актуальныя і злабадзённыя праблемы студэнцкага жыцця, ён часта арганізоўвае дыспуты па новых кнігах нашых пісьменнікаў. Так, 17 лістапада ў групе быў праведзены дыспут па раману А. Гладзіліна «Гісторыя адной кампаніі».

Яшчэ не закончыліся размовы фізікаў аб уражаннях, якія пакінула ў памяці кніга А. Гладзіліна, як куратар сумесна з супрацоўнікамі абанента бібліятэкі нашага універсітэта 29 снежня арганізаваў новы дыспут па кнізе Н. Дзяменьцева «Замужжа Таццяны Бяловай». Як і першы, ён таксама вельмі спадабаўся студэнтам. Гаворка вялася цікавая, прыводзілася многа канкрэтных фактаў з кнігі. Перад дыспутам кожны прачытаў раман, уважліва прадумаў яго сюжэт. Змястоўна выступілі студэнты А. Папова, А. Козел, Г. Васільева, А. Ерафеенка і многія іншыя.

Л. ВАНШЫНА.

Ідзе сесія. Але па-ранейшаму аўдыторыі перапоўнены: у адных з іх праводзяцца кансультацыі, у другіх — экзамены. Кожны дзень прыносіць многа поспехаў фізікам. Большасць з іх добра засвоіла матэрыял. На здымку нашага нарэспандэнта А. Кадзета — студэнты трэцяга курса фізфака. Здадуць яны яшчэ некалькі экзаменаў і будуць лічыць, што палова універсітэцкага шляху пройдзена.

ФІЗІК—ГЭТА ГУЧЫЦЬ ГОРДА

Шмат фізікаў пішуць кніжкі, здымаюць кінафільмы. Бабулькі, седзячы на лаўках, хваляцца адна перад адной поспехамі ўнукаў — фізікаў. А мамы, аддаючы замуж дачок за фізікаў, не цікавяцца зарплатай зяцёў. І не дзіўна, што фізікі карыстаюцца асаблівай павагай у журналістаў. «Тонкія» газеты і «тоўстыя» часопісы адпаведна многа і часта расказваюць аб адкрыццях, аб лабараторных даследаваннях, аб жыцці фізікаў...

Мне таксама хочацца павесці сёння гутарку аб вучоным, маладым фізіку, які працуе ў нашым універсітэце. Тэрмін «малады» фізік у прымяненні да Валянціна Дзмітрыевіча Ткачова — азначэнне чыста колькаснае: яму дваццаць сем год, у яго наперадзе шмат часу, якога, між іншым, ужо і не хапае (яшчэ адна несуразнасць часу, але ўжо не эйнштэйнаўскага). У астатнім — гэта вучоны ўжо са сваім імем, са сваімі вучнямі. Яго даклады аб пауправадніках чыталіся на канферэнцыях у Францыі і Японіі. Кажуць, поспех В. Д. Ткачова не ёсць нешта нечаканае, фенаменальнае, прычына іх—упартая праца. Гэта сапраўды так, калі сюды дадаць яшчэ наяўнасць пэўных і, прытым, вялікіх здольнасцей і мэтанакіраванасць даследчыка.

Фізіку Валянцін Дзмітрыевіч «знайшоў» яшчэ ў школе, а ва універсітэце, куды паступіў ў 1955 годзе, палюбіў яе ўсім сэрцам. З другога курса ён пачаў займацца паўправаднікамі, якія былі спачатку «Амерыкай для Калумба». Працаваць прышлося шмат. І вось першы поспех — дыпломная праца атрымала вышэйшую адзнаку. Тэма даследавання была замацавана за ім. Ею зацікавіліся ў Інстытуце фізікі АН БССР. Улюбёнасць да фізікі не перашкаджала захапляцца літаратурай і мастацтвам, спортам. Ён выканаў першы разрад па гімнастыцы, з усімі паспяваў на вечары адпачынку, у тэатры, кіно...

У 1960 годзе В. Д. Ткачова запрасілі ў інстытут імя Лебедзева, у фізічны алімп краіны. Гонар вялікі, а адказнасць яшчэ большая: «алімпійцы» працуюць, як кажуць, больш, чым на поўную магутнасць. Тут Валянцін Дзмітрыевіч напісаў сваю кандыдацкую дысертацыю і паспяхова абараніў яе ў нашым універсітэце. Тады ж ён выязджаў у Парыж, дзе выступіў з дакладам на канферэнцыі. Потым маладому вучонаму даручылі кіраваць кафедрай пауправаднікоў і адной з лабараторый. Выдатны пачатак!

Адноўчы нехта з сяброў Валянціна Дзмітрыевіча пажартаваў:

— Ткачоў на пауправадніках едзе.

Яго паправілі:

— Толькі не пауправаднікі яму служаць, а ён ім. І служыць добра.

Вядома, поспехі Валянціна Дзмітрыевіча ёсць поспехі не толькі яго аднаго. Навука не можа быць справай адзіночак, якімі б таленавітымі яны не былі: у наш час вельмі вялікім стаў аб'ём даследаванняў нават у самай вузкай галіне. Таму сучасныя лабараторыі аб'ядноўваюць вакол сябе шмат людзей, якія сумесна вырашаюць пытанні. Але пры гэтым індывідуальнасць вучонага ніколі не губляецца. Валянцін Дзмітрыевіч удзячны супрацоўнікам лабараторыі і лічыць, што яго асабістыя поспехі — гэта і поспехі яго паплечнікаў і настаўнікаў. Сярод апошніх прафесар А. Н. Сеўчанка, І. Г. Некрашэвіч, прафесар В. С. Вавілаў.

Ўсё, бадай, і ўсё пра Валянціна Дзмітрыевіча Ткачова. Хаця не. Што гэта за размова пра фізіка без успаміну аб «фізіках і лірыках»? Ужо стала традыцыяй шукаць у фізіках лірыку, даведвацца, якія паэты, пісьменнікі, кампазітары ім падабаюцца, якімі песнямі, танцамі захапляюцца. Я люблю вершы сучасных савецкіх паэтаў, зазначае вучоны, асабліва паэзію Роберта Раждественскага і Яўгенія Еўтушэнкі, люблю слухаць эстрадныя песні. Спадзяюся, што ніколі не перастану любіць новагоднія балы. Калі іх наведваеш, забываешся на свой ужо немалады ўзрост, жартуе ў заключэнні Валянцін Дзмітрыевіч.

Л. МІНДЛІН.

ВАСТРЭЙ ПЕР'І—РЭДАКТАРЫ

Нядаўна праходзіў агляд насценнага друку вышэйшых навучальных устаноў Ленінскага раёна. Мы папрасілі члена журы, супрацоўніка нашага універсітэта М. Чартко падзяліцца сваімі ўражаннямі.

— Ад універсітэта былі прадстаўлены газеты трох факультэтаў: філалагічнага, біялагічнага і гістарычнага. Прыемна, што ў ліку лепшых была адзначана газета біяфака «За мічурынскую біялогію» (яна цяпер выходзіць пад назвай «Vita»), а таксама «Слова філолага». Члены журы адзначылі, што гэтыя насценгазеты багаты па зместу, разнастайныя па форме падачы матэрыялаў, з цікавым афармленнем. Ставілася ў прыклад таксама і багатае ілюстраванне гэтых газет. У мой жа час было выказана пажаданне змяшчаць больш артыкулаў пра побыт і культуру паводзін студэнтаў. Дарэчы, на гэта трэба звярнуць больш увагі і рэдактарам астатніх факультэцкіх выданняў. Прыемна, вядома, што на аглядзе адзначаны лепшымі нашы газеты. Але не трэба заспакойвацца і лічыць, што нам ўсё зроблена. Не. Студэнцкае жыццё шматграннае, яно штодзённа выносіць на парадак дня многа новых і цікавых тэм: праблемы ўзаемаадносін калектыва і асобы, іх выхаванне на рэвалюцыйных традыцыях, у духу самаадданага і кваліфікаванага будаўніка камунізма і іншыя. Трэба, каб насценная газета не толькі асвятляла тое, што ўжо маецца на факультэце, а была першым і сапраўдным пачынальнікам размоў, дыскусій па пытаннях камсамольскага і студэнцкага жыцця. Неабходна, каб кожны камсамолец, актывіст лічыў сваёй першачарговай задачай выступіць у насценгазеце, параіцца, расказаць, як жывуць курс, група, таварышы. Гэтым самым мы зможам зрабіць наш друк больш масавым і дзейсным.

Нядаўна першакурснікі аддзялення беларускай мовы і літаратуры пабывалі ў музеі Вялікай Айчыннай вайны, пазнаёміліся з багатымі экспанатамі аб гераічнай барацьбе беларускага народа супраць гітлераўцаў.

На здымку: былы сакратар падпольнага камітэта партыі Іван Дзмітрыевіч Ветраў гутарыць са студэнтамі.

Фота Анатоля Бутэвіча,



Справы кафедральныя

НЕАД'ЕМНАЯ ЧАСТКА НАШАЙ РАБОТЫ

нальнага і крымінальна-працэсуальнага заканадаўства рэспублікі і практыкі яго прымянення. Вялікую карысць судова-пракурорскім работнікам прынеслі выданыя за апошнія гады манаграфіі І. І. Гарэліка «Адказнасць за пастаноўку у небяспечнасць па савецкаму крымінальнаму праву», П. А. Дубцова «Адказнасць за цалесныя пашкоджанні па савецкаму крымінальнаму праву», Я. В. Кічыгінай «Адказнасць за парушэнне бяспекі руху гарадскога транспарту».

Па просьбе загадчыка кафедры крымінальнага права І. С. Цішкевіча выпэтрабаваны для яго крымінальныя справы, якія звязаны з прымяненнем законадаўства аб неабходнай абароне за час увядзення новага Крымінальнага кодэкса БССР (пяць год). Дасканалае вывучэнне гэтых спраў аказала вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы манаграфіі аб неабходнай абароне, якую мяркуецца выдаць у бліжэйшы час.

Пры шырокім і актыўным удзеле практычных супрацоўнікаў Вярхоўнага суда БССР, Пракуратуры БССР, пракуратуры БВА быў абмеркаваны нядаўна выданы падручнік па асаблівай частцы савецкага крымінальнага права.

На кафедры працуюць у якасці выкладчыкаў з пагадзіннай аплатай вопытныя супрацоўнікі органаў суда і пракуратуры намеснік Пракурора Беларускай ССР П. В. Дудкоўскі, начальнік аддзела Пракуратуры рэспублікі М. М. Шымановіч, намеснік Старшыні Вярхоўнага суда Беларускай ССР Л. К. Зайцаў і іншыя. Яны прыцягваліся для кіраўніцтва напісаннем дыпломных работ, рэцэнзіравання курсавых і кантрольных.

Тэматыка большасці дыпломных, а таксама навуковых дакладаў у гуртках цесна звязана з практыкай органаў суда, пракуратуры і іншых. Ад студэнтаў-выпускнікоў кафедра патрабуе, каб яны ў сваіх дыпломных працах выкарыстоўвалі матэрыялы мясцовай судова-пракурорскай практыкі ці практыкі работы органаў МАГП, прычым не толькі ў выглядзе ілюстрацыі, а і ў абагуленых даных. Матэрыялы мясцовай практыкі выкарыстоўваюцца таксама і ў курсавых работах.

Пры правядзенні спецсемінараў па крымінальнаму праву і працэсу выкарыстоўваюцца канкрэтныя матэрыялы, спецыяльна перапрацаваныя і прыстасаваныя для вучэбных мэт. Аднак ёсць некаторыя цяжкасці ў перадрукаванні матэрыялаў. Таму колькасць вучэбных спраў параўнальна невялікая, што адмоўна ўплывае на правядзенне спецсемінараў.

З удзелам выкладчыкаў кафедры праводзяцца экскурсіі студэнтаў у перавыхаваўча-працоўныя калоніі, арганізоўваецца шмат сустрэч з супрацоўнікамі суда, пракуратуры, МАГП і іншых. Гэтыя сустрэчы праводзяцца пад адзінай тэматыкай — «Ваша будучая прафесія». Перад студэнтамі выступілі Пракурор БССР А. Г. Бондар, Старшыня Вярхоўнага суда рэспублікі С. Т. Шардыка, яго намеснік Л. К. Зайцаў, намеснік Пракурора БССР П. В. Дудкоўскі, кіруючыя супрацоўнікі МАГП, найбольш вопытныя суддзі. Арганізацыяй і правядзеннем сустрэч вось ужо на працягу многіх год займаецца І. І. Гарэлік, які выключна добрасумленна адносіцца да даручанай справы.

Калектыў кафедры прымае актыўны ўдзел ў прапагандзе савецкага права сярод насельніцтва, рэгулярна выступае з лекцыямі па пытаннях прымянення дзейнічаючага Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР перад супрацоўнікамі органаў суда, пракуратуры, аховы грамадскага парадку, а таксама перад слухачамі грамадскіх універсітэтаў прававых ведаў. Такія лекцыі чытаюцца не толькі ў Мінску, а і ў абласных цэнтрах, іншых населеных пунктах рэспублікі.

За актыўны ўдзел у рабоце грамадскага універсітэта прававых ведаў і ў прапагандзе савецкага права сярод насельніцтва неаднаразова ўзнагароджваліся граматамі рэспубліканскіх і абласных арганізацый І. С. Цішкевіч і М. Н. Меркушаў.

Аднак кафедра крымінальнага права лічыць, што ёю выкарыстаны далёка не ўсе магчымасці для ўстанаўлення яшчэ больш цеснай сувязі з практычнымі работнікамі. Калектыў кафедры добра разумее, што без пастаяннага пашырэння і ўзмацнення сувязі з практыкай немагчыма паспяховая вучэбная і навуковая праца. Нам вельмі хацелася б арганізаваць стажыраванне навуковых супрацоўнікаў ў органах суда і пракуратуры. Але, нажаль, дзейнічаючая інструкцыя па гэтаму пытанню не дазваляе скарачаць педагагічную нагрузку. Не выпадкова, што ніхто з прафесарска-выкладчыцкага складу факультэта не пажадаў праходзіць стажыроўку.

І. СТАНІСЛАВАЎ.

Спорт

СПАРТАКІЯДА КЛІЧА

Пасля Новага года наш карэспандэнт В. Ф. Комар узяў інтэрв'ю ў загадчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту В. П. Шапялевіча. Ён папрасіў расказаць аб будучых спартыўных баталіях.

— У гонар 50-годдзя Вялікага Кастрычніка,—сказаў В. П. Шапялевіч,—у нашай рэспубліцы праводзіцца круглагадавая комплексная спартакіяда спартыўных клубаў вышэйшых навучальных устаноў. У ёй актыўны удзел прымаюць студэнты нашага універсітэта. Ім прадстаіць выканаць экзамен па шаснаццаці відах спорту. У канцы студзеня адбудзецца зімняе першынство па лёгкай атлетыцы, летняе—намечана на 30 мая—2 чэрвеня, а да гэтага ў Гродна зробяць забег нашы спартсмены на вясенніх кросе. Пасля гэтых сустрэч нам прадстаіць прыняць удзел у XI зімняй спартакіядзе (14—18 лютага) па лыжах, каньках, хакею, слалому і біятлому. Занальныя і фінальныя гульні і спаборніцтвы па баскетболу, настольнаму тэнісу, валейболу, боксу, класічнай і вольнай барацьбе, плаванню адбудуцца ў сакавіку—маі. Прыкладна ў гэтыя ж месяцы нам прадстаіць абараняць гонар нашага універсітэта па спартыўнай і мастацкай гімнастыцы, цяжкай атлетыцы, веласпорту. Май будзе месяцам футбола, а чэрвень падвядзе вынікі па ручному мячу.

Як бачыце, праграма вельмі напружаная і толькі высокая арганізаванасць, жаданне ўсіх спартсменаў у поўную сілу выступіць і паказаць свсё высокае майстэрства дадуць магчымасць універсітэту заняць належачае яму месца ў спартакіядзе.

Не адну перамогу атрымалі нашы баскетбалісткі на спартыўных пляцоўках рэспублікі і за яе межамі. Вядома, што поспехі не прыходзяць самі па сабе. Яны з'зўляюцца вынікам напружаных трэніро вак. Вось чаму дзяўчаты са зборнай так часта наведваюць спартыўную залу, так уважліва адносяцца да заўваг трэнера.

Фота А. Кадзета.

ПЕРАМАГАЮЦЬ МАЦНЕЙШЫЯ

Многія студэнты нашага універсітэта любяць бокс і займаюцца гэтым мужным відам спорту. Па іх просьбе ганаровы майстар спорту СССР В. Крывабок расказвае, як прайшлі баі баксёраў на званне мацнейшых у памяшканні ДСО «Працоўныя рэзервы».

У гэтым годзе будзе праведзена Спартакіяда народаў СССР. Беларускія спартсмены старанна рыхтуюцца да Усесаюзнага агляду сілы, лоўкасці і прыгажосці. У сталіцу нашай рэспублікі прыехалі прадстаўнікі ўсіх абласцей. На рынгу разгарэліся ўпартыя паядынкі за авалод анне тытулам чэмпіёнаў рэспублікі. Першыя баі прынеслі балельшчыкам шмат сюрпрызаў. М. Шэйн, які перайшоў у больш цяжкую вагавую катэгорыю, прайграў свайму аднаклубніку Л. Галакціонаву. Я атрымаў траўму і выйшаў з далейшых спаборніцтваў.

Баксёры праводзяць баі ў высокім тэмпе. Прымяняецца вялікі арсенал тэхнічных прыёмаў, дэманструецца выдатная валявая падрыхтоўка. У фінале сустрэліся мацнейшыя. У найлягчэйшай вазе спартакавец з Мінска Г. Ручаеўскі перамог баксёра з Гродна В. Вяльчэнкава. Леў Галакціонаў («Спартак», Мінск) выйграў у аднаклубніка А. Жукоўскага. У паўлёгкай вазе перавага была на баку майстра спорту В. Кочанева, які выйграў у В. Раманава — («Спартак» Мінск). У лёгкай вазе пераканаўчую перавагу атрымаў майстар спорту Г. Канелоўскі. Міхаіл Данілаў атрымаў выдатную перамогу над В. Гурскім. У другой паўсярэдняй вазе чэмпіёнам стаў В, Фертман. Характэрна, што ўсе паядынкі напярэдадні фінала ён правёў датэрмінова, большасць з накдаўнам. Раней тэрміну ён закончыў і фінальны бой. Вельмі ўпартым паядынкам быў бой баксёраў першай сярэдняй вагі Б. Русака і В. Гарошка, якія прадэманстравалі вялікую сілу волі, выдатную баксёрскую падрыхтоўку. Б. Русак стаў чэмпіёнам БССР. У другой сярэдняй вазе пераможцам аказаўся В. Арлоў.

А нядаўна на рынгу сустрэліся маладыя баксёры рэспублікі. Паядынак паказаў, што ў нас расце выдатнае папаўненне, здольная замена нашым майстрам боксу. Праўда, многім юнакам яшчэ далёка не хапае вопыту турнірных баёў, тактыкі і спрыту, але гэта, як кажуць, справа нажыўная. Пры пошуках новага, пры старанных адносінах да трэніровак многія з іх стануць выдатнымі майстрамі рынгу.

У канцы мне хочацца пажадаць, каб універсітэцкія аматары боксу заўсёды памяталі, што бокс — гэта адзін з самых складаных і мужных відаў спорту, таму ён патрабуе ад кожнага старанной фізічнай падрыхтоўкі, смеласці і рашучасці ў вядзенні бою. І галоўнае тое, што той малады баксёр, які па сапраўднаму палюбіць рынг, абавязкова стане майстрам цвёрдай пальчаткі.

В. КРЫВАБОК,
ганаровы майстар спорту СССР.

Іх было трыццаць

З МАЛЫХ ГОД мяне вабіла неба. Вось, думалася, падняцца ў гэты блакіт, паглядзець, як выглядаюць нашы палі, лес, вёска адтуль, з вышыні. Не пакідала мяне гэтая мара, калі я прышоў вучыцца ва універсітэт. На вялікую сваю радасць даведаўся, што ў БДУ пры ДТСААФ ёсць усе магчымасці стварыць парашутную секцыю. Вось толькі людзей, сказалі мне, малавата. Пагаварыў са сваімі таварышамі, а таксама са студэнтамі іншых факультэтаў — летуценнікаў зрабіць першы крок у блакітнае неба падабралася трыццаць чалавек. Смелых, рашучых і любячых гэтую справу юнакоў і дзяўчат. Мы лічылі, што праз дзень-два пасля арганізацыі секцыі пачнуцца скачкі з самалёта. Але не так гэта было. Пачалася сапраўдная, напружаная вучоба. Трэба было, як нам гаварылі, засвоіць усю азбуку парашутыста. А яна аказалася складанай...

Першы крок у неба запамятаўся на ўсё жыццё. Як ні дзіўна, але нічога страшнага і асабліва складанага тут не было. Паявілася толькі з таго часу адно—цяга да парашута, непераадольная любоў да яго. Я іншы раз думаю: «Як бы жыў цяпер без парашута, без магутнага стрэчнага ветру ў блакіце...»

Цяпер у секцыі 80 чалавек. Знамянальна тое, што ў ёй — прадстаўнікі амаль усіх факультэтаў. Усе мы верым, што парашутны спорт у хуткім часе стане самым масавым і вядучым у нашым універсітэце.

Тэкст і фота В. Озерава

На здымку: студэнтка хімфака Вера Фаміна трэніруецца на стапелях.

ШАШКІ

ПАСВЯЧЭННЕ Ў МАЙСТРЫ

Хутка расце спартыўнае майстэрства юнага шашыста Анатоля Гантварга. У студзені на першынстве УЦСПС ён заваяваў залаты медаль, а па юнацкім першынстве краіны ў чэрвені мінулага года ён у чацвёрты раз запар стаў чэмпіёнам краіны сярод юнакоў па міжнародных шашках. Але дагэтуль яму ні разу не даводзілася выступаць у чэмпіянаце краіны сярод дарослых. Добра згуляўшы ў паўфіналах, якія праходзілі ў горадзе Усць-Каменагорску, ён стаў фіналістам першынства СССР, якое толькі што закончылася ў Маскве. Спачатку яго гульня ў фінале была няўпэўненай, але пасля нічых з прэтэндэнтам на званне чэмпіёна свету рыжскім гросмайстрам Андрысам Андрэйкам і вядомымі міжнароднымі майстрамі. Анатоль, як кажуць, выраўняўся, а затым яго тактыка стала востра агрэсіўнай. Дастаткова сказаць, што ён атрымаў тры перамогі запар. У выніку А. Гантварг раздзяліў сёмае—дзесятае месцы. Аб яго выключным выніку сведчыць той факт, што ад чэмпіёна краіны А. Андрэйкі ён адстаў усяго на 2,5 ачка. У гэтым годзе Анатоль Гантварг вытрымаў яшчэ адно выпрабаванне—конкурсныя экзамены на матэматычны факультэт нашага універсітэта. Яго мара здзейснілася. Ёсць усе магчымасці даказаць, што складаныя законы шашачнай гульні можна перакласці на мову электроннай вылічальнай машыны.

Г. ДРАБУШЭВІЧ.

АБАВЯЗАК КОЖНАГА СТУДЭНТА

Усе мы памятаем тыя цяжкасці і радасці, з якімі сустрэліся на ўступных экзаменах ва універсітэт. Для кожнага запамятаўся і той дзень, калі ён упершыню трымаў у руках невялічкую кніжачку, дзе прыгожымі літарамі выведзена: «Студэнцкі білет», які пасля напружанай пяцігадовай вучобы замяняецца дыпломам. Але здараецца так, што асобныя студэнты не надаюць асаблівага значэння гэтай кніжцы і... нават губляюць яе. Такіх, нажаль, нямала. І вельмі правільна робяць тыя дэканаты, якія сурова ставяцца да тых, хто абыякава адносіцца да студэнцкага пасведчання.

Непрыемна, што сярод такіх студэнтаў сустракаюцца і выпускнікі. Гэта Ларыса Аляксандраўна Талчак (нумар студэнцкага білета 610 326), Ігар Майсеявіч Трахтэнберг (60 783), Алег Валянцінавіч Кавалёў (60 472), Алег Саламонавіч Мельнікаў (610 648), Галіна Іванаўна Жаўна (610563), Васіль Іванавіч Стражаў (610 542), Сцяпан Рыгоравіч Мулярчык (610 488) і іншыя.

Берагчы студэнцкія дакументы, ганарыцца імі — абавязак кожнага.

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 17206. **Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, I паверх, п. 106, тэл. Б-2-07-19, Друкарня выдавецтва «Звязда».** Зак. 1730.